**Ніна ГАРАГЛЯД**



# Светлыя згадкі

*Мініяцюры*

Зімовыя святы былі для нас, колішняй вясковай дзятвы, без водару мандарынаў. Гэта цяпер у сельскіх магазінах купіш экзатычныя бананы, ківі. А ў маім дзяцінстве прынесеныя матуляй пасля службы ў царкве падушачкі ў шэрым кульку былі раскошай.

* * *

У святы вечар дзятва старалася раней за старэйшых выбрацца калядаваць. Бо першым больш шчодра даюць. Тыя ж бурчэлі на нас: «Маляўкі...» А мы мясілі снег нагамі ў валёнках, ішлі ад хаты да хаты, спявалі пад вокнамі калядныя песні, якім нас навучылі матулі. З кожнай новай хатай торбачка цяжэла. Каторыя гаспадары не баяліся, што наслядзім, пускалі ў кухню, частавалі гарачай крывянкай прама з патэльні. Насыпалі ў кішэнь гарбузікаў. І прасілі яшчэ спяваць калядныя песні. Радасныя ад цёплага прыёму, мы акрылена са «звяздой» рушылі далей, пакуль не апыналіся на канцы вёскі. А потым была дзяльба накалядаванага. Усё было сумленна, каб нікога не пакрыўдзіць. А грошай нам ніхто не даваў. Старэйшым — магчыма. Бо потым яны наладжвалі вечарынку ў хаце ўдавы Аўдоцці. Тая заганяла сваіх дзяцей на печ. А сама толькі паспявала паліваць падлогу вадой з кубка — так моладзь танцавала, што пыл курыўся. Нам было цікава паглядзець, паслухаць, як іграе кучаравы Пецька-гарманіст. Уткнуўшы насы ў шыбы, зазіралі. Пакуль хтосьці са старэйшых хлопцаў не выходзіў у двор пакурыць і не цыкаў на нас: «Псік спаць, малеча!»

* * *

Сена пад абрусам — калядны пах у хаце. Маці моліцца на абразы, каб усе былі жывыя-здаровыя. Каб вайны не было, каб стол не збяднеў... Я слухаю і думаю: «Бог чуе маю матульку і будзе да нас з ласкай...»

* * *

За святочным сталом гаварылі пра святое, пра будучыню, уладкаванне дзяцей у жыцці. Грэх было ганіцца, тым больш хадзіць п'яным па вёсцы. Ды і не было тады такіх...



Фота з архіва БелТА.

* * *

Па бялюткім снезе, нібы па палатняным сувоі, іду з аўтобуса напрасткі да сваёй палескай вёскі. Хто куды раз'ехалася колішняя дзятва. Сёння вёска — лічы хутар — пяць жывых хат. Многія мае землякі перабраліся на могілкі. І тужліва шчыміць сэрца: усё тое колішняе, маладое, летуценнае не вернецца.

А сцежка дамоў кліча праз сотні кіламетраў. І кожныя Каляды ты тут. Станеш перад акном хаты, дзе жыве сястра, і запяеш:

*Пані гаспадыня, дазвольце Каляду заспяваць,*
*Новага году прычакаць.*
*Міру, спакою, добрага здароўя...*

І на ганак выходзіць сястра, якой ужо пад дзевяноста гадкоў. Мы абнімаемся, плачам і смяёмся. А калядныя зоркі падміргваюць з неба, нібы кажуць: «Усё будзе добра. Каб толькі людзі святое не пагублялі...»